Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

14 чэрвеня 2017 года, № 10 (2178)

ПАДЗЕЯ

Самая высокая пазіцыя БДУ ў рэйтынгу ўніверсітэтаў свету!

Вядомае брытанскае рэйтынгавае агенцтва Quacquarelli Symonds 8 чэрвеня апублікавала чарговы рэйтынг найлепшых 800 універсітэтаў свету QS World University Rankings 2017/18. БДУ ў чарговы раз значна палепшыў свае пазіцыі ў сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы, **падняўшыся на 20 пунктаў, заняў 334 месца** (усяго ў свеце налічваюць больш за 30 000 ВНУ). Гэта самы высокі вынік нашага ўніверсітэта за ўсю гісторыю ўдзелу ў міжнародных рэйтынгах.





Адзначым, БДУ планамерна працягвае сваё ўзыходжанне ў дадзеным рэйтынгу. Так, у 2016 годзе БДУ займаў 354 месца, у 2015 – 421–430 месца, у 2014 – 491–500, у 2013 – 551–600.

У рэйтынгу QS улічваюцца колькасныя дадзеныя пра вышэйшую навучальную ўстанову і апытанні незалежных экспертаў. Выкарыстоўваюцца такія паказчыкі, як вынікі апытання экспертаў (акадэмічная рэпутацыя), вынікі апытання працадаўцаў, цытаванне навуковых прац за апошнія 5 гадоў, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, колькасць замежных студэнтаў і выкладчыкаў і інш. Рэйтынг QS уваходзіць у тройку самых вядомых сусветных рэйтынгаў, менавіта на яго галоўным чынам арыентуюцца расійскія ўніверсітэты, якія ўваходзяць у праект «5-100».

У рэйтынгу QS 2017/18 сярод беларускіх ВНУ апроч БДУ прадстаўлены таксама БНТУ (751-800).

На першых месцах у абноўленым рэйтынгу размясціліся амерыканскія ВНУ: Масачусецкі тэхналагічны інстытут, за ім стаіць Стэнфардскі ўніверсітэт, замыкае тройку Гарвардскі ўніверсітэт.

Пазіцыі некаторых вядучых універсітэтаў іншых краін: МДУ імя М. В. Ламаносава (95 месца), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (240), Казахскі нацыянальны ўніверсітэт імя аль-Фарабі (236), Тартускі ўніверсітэт (314), Варшаўскі ўніверсітэт (411–420), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі (411–420), Вільнюскі ўніверсітэт (401–410) і Латвійскі ўніверсітэт (701–750), Універсітэт Коменскага ў Браціславе (701–750), Люблянскі ўніверсітэт (651–700), Карлаў універсітэт (Чэхія) (314), Сегедскі ўніверсітэт (Венгрыя) (501–550), Універсітэт Заграба (601–650).

Варта таксама адзначыць, што Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт паказвае высокія пазіцыі і ў іншых вядомых сусветных рэйтынгах і стабільна ўваходзіць у 2 працэнты найлепшых універсітэтаў свету.

Павел САЛАЎЁЎ

У нумары:

ІНФАГРАФІКА. ЧАС ПРАЦЫ
Прыводзім вынікі сёлетняга размеркавання выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
Стар. 2

ПОШУК КРЭАТЫЎШЧЫКАЎ
У БДУ адкрыецца першы ў Беларусі інавацыйны цэнтр «SAP Next-Gen Lab»
Стар. 3

ПРАЦА ЯК ПАВЕТРА
Інтэрнат №7 прызнаны найлепшым у студгарадку ў 2016/2017 навуч. годзе
Стар. 4

Весткі з рэктарата

УЗНАГАРОДЫ спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў уручаныя 29 мая студэнтам БДУ.

Нагрудныя знакі атрымалі шэсць прадстаўнікоў ФПМІ – пераможцы Міжнароднай студэнцкай алімпіяды ў галіне інфарматыкі і праграмавання – чацвёртакурснікі *Аляксей Паліевіц*, *Канстанцін Сокал*, *Павел Шафцялевіч*, *Канстанцін Вільчэўскі*, *Анастасія Жыркевіч* і магістрант *Уладзіслаў Сатанеўскі*.

СТАРШЫНЁЙ студэнцкага савета па якасці адукацыі БДУ абраны чацвёртакурснік гістарычнага факультэта *Артур Кандраценка*.

Намеснікам старшыні ССЯА стаў другакурснік гістфака *Раман Зубачоў*. Новым сакратаром прызначана першакурсніца хімічнага факультэта *Юлія Баярскіх*.

Вынікі працы студэнцкай арганізацыі за 2016/2017 навуч. г. былі падведзены 26 мая. Са справаздачай выступіла экс-старшыня арганізацыі Яна Дыба.

ПРАТАКОЛ аб намерах супрацоўніцтва ў арганізацыі сумесных даследаванняў у галіне прыкладных фізічных праблем падпісаны паміж БДУ і Універсітэтам навукі і тэхналогій імя Хуары Бумедзьена (Алжыр). Цырымонія адбылася ў перыяд працы 50-й Міжнароднай прамысловай выставы «FIA 2017» у Алжыры.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Каб скарыстацца мультымедыйным кантэнтам газеты:

1. *Загрузіце на смартфон прыкладанне* ***Aurasma***
2. *Падпішыцеся на канал* ***#bsuby***
3. *Навядзіце камеру на выяву з пазнакай*

РАЗМЕРКАВАННЕ

Са снежня 2016 да канца красавіка 2017 у БДУ прайшлі асноўныя пасяджэнні камісій па размеркаванні выпускнікоў, запланаваныя ў адпаведнасці з графікам на 2017 год.

Размеркаванне праходзіла ва ўмовах «двайнога» выпуску.

На сёння размеркавана каля **98 %** выпускнікоў першай ступені вышэйшай адукацыі (96 % ужо атрымалі першае месца працы, а 2 % скарысталіся правам на свабоднае працаўладкаванне).

Колькасць выпускнікоў, якія падлягаюць размеркаванню: 57 % жаночага і 43 % мужчынскага полу.

Узроставыя катэгорыі выпускнікоў: 20 гадоў і маладзей – 9 %; 21 год – 46%; 22 гады – 39 %; 23 гады – 4 %; 24 гады – 1%; 25 гадоў і старэй – 1%.

Размеркаванне ў першую чаргу ажыццяўлялася ў арганізацыі-замоўцы кадраў, з якімі ўніверсітэт склаў дамовы пра ўзаемадзеянне.

На педагагічную працу размеркавана **13 %** выпускнікоў (філфак, гістфак, біяфак, хімфак, геафак, ФФСН, ММФ).

У распараджэнне НАН Беларусі – **4 %**.

У СМІ РБ – **4%**. Журналістыка «друкаваныя СМІ» – галоўным чынам у рэгіянальныя газеты.

У ПВТ размеркавана **16 %** выпускнікоў (ФПМІ, ММФ, РФКТ, фізфак, ФСК).

Асноўны прыток імянных заявак сёлета назіраўся з лютага па красавік.

Тэрміны выбару месца для працаўладкавання розныя. Ёсць студэнты, якія пачынаюць сваю працоўную дзейнасць у перыяд вучобы, ёсць тыя, хто пасля практыкі атрымлівае магчымасць жаданага месца працы, і, адпаведна, тыя, хто да заканчэння апошняга курса не думае пра будучае месца працы і чакае, што прапануюць на выхадзе.

Пры размеркаванні выпускнікоў арганізацыі не падзяляюцца па формах уласнасці. Сёння гэта актуальна. Прыярытэт адпаведна аддаецца толькі асноўным замоўцам кадраў.

У рэгіёны накіравана **30 %** выпускнікоў.

26 выпускнікоў, якія навучаліся на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, атрымаюць накіраванне для працы па спецыяльнасці ў аграгарадку, малыя гарады і сельскую мясцовасць у адпаведнасці з заключанымі кантрактамі.

Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ



НАША СПАДЧЫНА

Дынастыі, звязаныя лёсам з БДУ

Прэзентацыя кнігі пра сямейныя дынастыі «Лёсам звязаныя з БДУ» адбылася 25 мая.

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Кніга распавядае пра 14 прафесарска-выкладчыцкіх дынастый, прадстаўнікі якіх працавалі і працягваюць прафесійныя традыцыі ў БДУ. Сярод іх вядомыя навукоўцы, рэктары, прарэктары, дэканы, загадчыкі кафедраў, выкладчыкі. Кожны з іх зрабіў значны ўнёсак у развіццё і станаўленне ўніверсітэта.

Адкрывае выданне першы рэктар БДУ Уладзімір Пічэта. Менавіта ён стаў заснавальнікам не толькі вядучай ВНУ Беларусі, але і ўсёй універсітэцкай супольнасці.

Некаторыя сем'і ў сваім радаводзе налічваюць чатыры пакаленні. Напрыклад, дзясяты рэктар БДУ Канстанцін Лукашоў у 1952 годзе ўзначаліў БДУ. Сёння яго сямейным прадаўжальнікам стаў унук – дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і геафізікі геаграфічнага факультэта БДУ ***Алег Лукашоў***. Шмат прапрацаваў у БДУ і пляменнік яшчэ аднаго рэктара – ***Фёдар Сеўчанка***, які займаў пасаду намесніка дырэктара па гаспадарчай частцы НДІ прыкладных фізічных праблем, што носіць імя яго знакамітага сваяка Антона Сеўчанкі. Таксама цяперашні дэкан хімічнага факультэта ***Дзмітрый Свірыдаў*** працягвае справу свайго бацькі – акадэміка Вадзіма Свірыдава, былога дырэктара НДІ ФХП.

Акрамя іх на ўрачыстым мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі вядомых універсітэцкіх сем'яў: ***Сяргей Умрэйка*** – навуковы супрацоўнік ННДЦ маніторынгу азонасферы БДУ, ***Уладзімір Навумовіч*** – дацэнт філалагічнага факультэта, ***Аляксандр Радына*** – дацэнт механіка-матэматычнага факультэта, ***Ірына Папова*** (дынастыя Чыгір) – супрацоўнік юрыдычнага факультэта, ***Вольга Ігнаценка*** – старшы выкладчык ФФСН, ***Аляксандр Бокі*** – выпускнік ФМА (дынастыя Царук), ***Святлана Лапіна*** – загадчык кафедры АКП РБ і кіраўнік інавацыйнай пляцоўкі ў БДУ, ***Аляксей Чалядзінскі*** – доктар фіз.-мат. навук, а таксама рэктар ***Сяргей Абламейка*** – родапачынальнік уласнай дынастыі (яго дачка Марыя з'яўляецца дацэнтам кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта).

Выданне не мае аналагаў ні ў адной ВНУ краіны. Сабраныя тут біяграфіі пададзены ў фармаце рэалістычных гісторый з вытрымкамі з дзённікаў, інтэрв'ю і ўспамінаў. Часткі дапоўнены наглядамі фотаматэрыяламі.

Па словах начальніка Псіхалагічнай службы БДУ *Руслана Папка*, дадзеная прэзентацыя падвяла вынік тыдня сям'і, які адбыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і ў рамках якога прайшло каля 20 мерапрыемстваў з удзелам болей як 1000 супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ. Арганізатары выказалі спадзяванне, што ўшаноўванне ўніверсітэцкіх дынастый стане яшчэ адной добрай традыцыяй, і паабяцалі працягнуць працу па сістэматызацыі інфармацыі пра сем'і выкладчыкаў БДУ.

Яраслаў РАМАНОЎСКІ

ПАДЗЕЯ

У БДУ адкрыецца першы ў Беларусі інавацыйны цэнтр «SAP Next-Gen Lab». Мемарандум падпісаны паміж БДУ, Аб'яднаным інстытутам прыкладной інфарматыкі НАН Беларусі, SAP СНД, «Санта Імпэкс Брэст» і ІВА.

Мемарандум аб адкрыцці інавацыйнага цэнтра ў БДУ падпісалі (злева направа): дырэктар па ІТ групы кампаній «Санта Імпэкс Брэст» Вадзім Міцкевіч, генеральны дырэктар «Айбіэй Айці Парк» Сяргей Акуліч, дырэктар прадстаўніцтва ТАА «САП СНД» у Рэспубліцы Беларусь Ілья Шуліпін, намеснік генеральнага дырэктара АІПІ НАН Беларусі Міхаіл Кавалёў і дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Павел Мандрык

Пошук крэатыўшчыкаў

Праца будзе арганізавана на базе цэнтра кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, студэнцкіх праектных семінараў, стартапаў і хакатонаў, куды будуць прыцягвацца найлепшыя студэнты.

Сёння ўжо вызначаныя тры асноўныя кірункі дзейнасці цэнтра. У першую чаргу тут будзе здзяйсняцца праца па рэалізацыі задач і праектаў бізнес-кампаній. У прыватнасці, адным з заказчыкаў паслуг цэнтра выступіў «Санта Імпэкс Брэст», які зацікаўлены ў інавацыйных рашэннях і прапановах супрацоўнікаў БДУ і працаўладкаванні выпускнікоў ВНУ. Для рэалізацыі бізнес-замоў плануецца прыцягваць прадстаўнікоў АІПІ НАН і ІВА.

Другі кірунак звязаны з адукацыйнай робататэхнікай. Цэнтр стане інавацыйнай пляцоўкай, дзе студэнты змогуць займацца праектнай дзейнасцю па стварэнні аўтаматызаваных машын для рашэння прамысловых задач. Тут будуць арганізаваныя заняткі па распрацоўцы розных мадэляў, сістэм кіравання імі, навучанні працы з робататэхнічнымі прыладамі. Будзе праходзіць сумесная з АІПІ НАН праца па падрыхтоўцы навучальна-метадычных праграм па адукацыйнай робататэхніцы, арганізоўвацца практычныя і лабараторныя заняткі са студэнтамі і практычныя канферэнцыі і семінары для супрацоўнікаў БДУ.

Праца ў цэнтры прадугледжвае розныя фарматы ўцягвання студэнтаў і выкладчыкаў у інавацыйную дзейнасць: ад лекцыйных заняткаў, знаёмства з перадавымі тэхналогіямі і прынцыпамі пабудовы новых бізнес-мадэляў у эпоху глабальнай лічбавай рэвалюцыі да рэалізацыі групавых і індывідуальных праектаў. Тут створаць усе ўмовы для запуску ўласнага стартапа. Студэнты і выкладчыкі БДУ атрымаюць доступ да ўнікальнага навучальнага матэрыялу SAP, змогуць прайсці дыстанцыйныя і вочныя курсы навучання, трэнінгі, тэхнічныя брыфінгі, арганізаваныя гэтай нямецкай карпарацыяй.

Майстар-клас Сяргея Панкратава

Трэці кірунак тычыцца матэматычнага мадэлявання лагістычных бізнес-працэсаў прадпрыемстваў. Любы заказчык зможа атрымаць колькасную ацэнку эфектыўнасці працы сваёй кампаніі, на аснове якой будуць дадзеныя рэкамендацыі па памяншэнні выдаткаў і павелічэнні прыбытку.

За дзень да інавацыйнага форуму SAP у Мінску, 17 мая, для студэнтаў і выкладчыкаў БДУ быў праведзены майстар-клас дырэктара па маркетынгу кампаніі САП СНД Сяргея Панкратава на тэму «Лічбавая трансфармацыя – новыя ролі і задачы ІТ-прафесіяналаў у сучасных рэаліях бізнесу». У мерапрыемстве прынялі ўдзел дырэктар цэнтра кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях БДУ Сяргей Маркаў, менеджары праграмы «Універсітэцкі альянс» «САП СНД» Юрый Купрыянаў і Ігар Сіўцоў.

Падобныя цэнтры на постсавецкай прасторы сёння функцыянуюць толькі ў пяці ВНУ Расіі: Маскоўскі тэхналагічны ўніверсітэт, Вышэйшая школа эканомікі, Расійскі дзяржаўны ўніверсітэт нафты і газу імя І. М. Губкіна, Санкт-Пецярбургскі нацыянальны даследчы ўніверсітэт інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі і Цюменскі тэхнапарк. Усяго на сёння адкрыта 29 інавацыйных цэнтраў SAP Next-Gen Lab у розных краінах.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

КОНКУРСЫ

Маладая навука па вялікім рахунку

Падведзены вынікі конкурсу «Найлепшая студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя БДУ» за 2016 год.

Галоўную прэмію конкурсу «Найлепшая СНДЛ» атрымала **«ГІС-лабараторыя»**, якую ўзначальвае загадчык кафедры глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм геаграфічнага факультэта Дзмітрый Курловіч. Нагадаем, што студэнты геаграфічнага факультэта БДУ заваявалі пяць дыпломаў на конкурсе геаінфармацыйных праектаў па прыродаахоўнай тэматыцы на міжнароднай школе маладых навукоўцаў, што адбылася 15–17 мая ў Нацыянальным парку «Нарачанскі». Гран-пры атрымала праца «Выкарыстанне дадзеных ДЗЗ і ГІС-тэхналогій для прасторава-часавага аналізу зялёных насаджэнняў сталіцы і абласных цэнтраў Беларусі» студэнта чацвёртага курса Максіма Максімава. У конкурсе ўдзельнічалі 27 праектаў студэнтаў з Беларусі, Польшчы, Украіны і Расіі.

Акрамя таго, былі вызначаны ўладальнікі прэмій у чатырох намінацыях. За *«Унёсак СНДЛ ва ўдасканаленне навучальнага працэсу»* найлепшымі прызнаны загадчык кафедры фізічнай электронікі факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, кіраўнік СНДЛ «Нанатэхналогіі і камп'ютарнае мадэляванне» ***Фадзей Камароў***; кіраўнікі СНДЛ «Камп'ютарны дызайн» дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій факультэта сацыякультурных камунікацый ***Сяргей Царык*** і старшы выкладчык кафедры інфармацыйных тэхналогій факультэта сацыякультурных камунікацый ***Ірына Сіроціна***.

У намінацыі *«Унёсак СНДЛ у падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі»* перамогу атрымалі асістэнт кафедры заалогіі біялагічнага факультэта, кіраўнік СНДЛ «Структура і дынаміка біяразнастайнасці» ***Алег Сінчук***; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта, кіраўнік СНДЛ «Гісторыя Беларусі XIX-XX стст.» ***Віталь Макарэвіч***.

У катэгорыі *«Навукова-даследчая і інавацыйная дзейнасць»* перамога прысуджана загадчыку НДЛ фізікі іонна-плазменнай мадыфікацыі цвёрдых целаў кафедры фізікі цвёрдага цела фізічнага факультэта, кіраўніку СНДЛ «Мадыфікацыя ўласцівасцяў матэрыялаў» ***Андрэю Куляшову***; выкладчыку кафедры міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін, кіраўніку СНДЛ «Інавацыйныя тэхналогіі ў турызме» ***Наталлі Барысенка-Кляпач***.

У намінацыі *«Дзейнасць СНДЛ па прыцягненні фінансавання»* найлепшымі сталі загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін геаграфічнага факультэта, кіраўнік СНДЛ «Рэгіянальныя дэмаграфічныя праблемы» ***Кацярына Анціпава***; дацэнт кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта, кіраўнік СНДЛ «Фальклярыстыка» ***Вольга Прыемка***.

Найлепшая станоўчая дынаміка за апошнія тры гады адзначана ў СНДЛ «Малекулярная біятэхналогія», якую ўзначальвае дацэнт кафедры малекулярнай біялогіі біялагічнага факультэта Яўген Нікалайчык.

Ларыса ПЕТРАВЕЦ

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Удзел у прамым эфіры радыё «Сталіца» намесніка начальніка ГУН БДУ Аляксандра Захарава на тэму навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў ВНУ – радыё «Сталіца» (07.06).

Пра апошні дзень рэгістрацыі на ЦТ у БДУ – СТБ (01.06), sb.by (02.06), СТБ (праграма «Што адбываецца?» (04.06).

Вынікі ўступнай кампаніі ў Ліцэй БДУ – kudapostupat.by, minsknews.by, wuz.by, zviazda.by (01.06).

Пяцікурсніца факультэта міжнародных адносін БДУ Марыя Журава перамагла ў конкурсе «Спартыўнае права ў Рэспубліцы Беларусь» – noc.by (23.05), wuz.by, pravo.by (24.05), union.by (26.05).

У БДУ адкрыўся першы ў Беларусі інавацыйны цэнтр «SAPNext-Gen Lab» – ecopress.by, wuz.by, znaniebelarus.by (26.05), tech.onliner.by, БелТА, news.21.by (29.05).

Пра адкрыццё ў магістратуры Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А.Д. Сахарава БДУ спецыяльнасці «медыцынская фізіка» – interfax.by (30.05), minsknews.by (01.06), zviazda.by (03.06), ecopress.by (07.06).

Аспірантка эканамічнага факультэта БДУ Вікторыя Фядотава стала «сярэбраным» прызёрам конкурсу Нацыянальнага банка Беларусі на найлепшую працу па эканамічнай тэматыцы сярод студэнтаў ВНУ – «Знамя юности», sb.by (01.06), wuz.by (02.06), fingramota.by (05.06), «Настаўніцкая», nastgaz.by (06.06).

Дацэнт юрыдычнага факультэта БДУ Алена Лаеўская перамагла ў намінацыі «Навука і права» штогадовага рэспубліканскага конкурсу інфармацыйных матэрыялаў па прававой тэматыцы на прыз імя У. Д. Спасовіча» – БелТА, megacat.by, pravo.by, sb.by (24.05), wuz.by (25.05), union.by (26.05).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УШАНАВАННЕ

Праца як паветра: інтэрнат №7 прызнаны найлепшым у студгарадку

Цёплыя словы падзякі і захапленне, песні, кветкі і ўзнагароды – так падводзіліся вынікі прэстыжнага конкурсу «Найлепшая арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў інтэрнаце БДУ».

Супрацоўнікі сёмага інтэрната з узнагародамі

Загадчыкі, каменданты, выхавальнікі, сацыяльныя педагогі, педагогі-арганізатары, інструктары па фізічнай культуры і студэнцкія саветы – усе тыя самыя людзі, якія арганізуюць жыццё студэнтаў у кожным інтэрнаце БДУ, клапоцяцца пра камфорт іх пражывання і вольны час. Ганаровыя госці ўрачыстага падвядзення вынікаў конкурсу – прарэктар па выхаваўчай і навучальнай рабоце У. В. Суворай, начальнік упраўлення выхаваўчай працы з моладдзю А. П. Багамазаў, дырэктар студгарадка А. У. Мелех.

На працягу двух гадоў адміністрацыя Студэнцкага гарадка БДУ выбірала найлепшы інтэрнат і найлепшы педагагічны калектыў. Сярод прафесіяналаў і незаменных працаўнікоў дзевяці інтэрнатаў складана было вызначыць, хто пераўзыходзіць калегаў у арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай працы. Нарэшце 1 чэрвеня шчаслівы ўладальнік кароннага тытула быў абвешчаны: перамог калектыў «сямёркі»!

Конкурс праводзіўся ў тры этапы. На першым завочным этапе педагагічныя калектывы інтэрнатаў прадстаўлялі экспертнай камісіі творчыя справаздачы пра зробленую працу, другі этап уяўляў сабою падрыхтоўку і правядзенне мерапрыемства па любым кірунку ідэалагічнай і выхаваўчай працы, на трэцім этапе конкурсу быў праведзены рэйд-агляд інтэрнатаў. Па выніках усіх трох этапаў і быў вызначаны пераможца.

Падвядзенне вынікаў конкурсу стала сапраўдным святам, якое прынесла сям'і інтэрнатаў шмат уражанняў, хвалявання і ўспамінаў. Перад калектывамі інтэрнатаў і гасцямі выступілі з пранікнёнымі песнямі студэнты з Казахстана «Ка-бэнд», а таксама студэнткі, удзельніцы і пераможцы конкурсаў студгарадка 2016–2017 года «Сярэбраныя струны», «Міс Вясна». Марына Самойлава – пераможца «Сярэбраных струн» у намінацыі «Аўтар» – у кампаніі сваёй высакароднай гітары колеру слановай косткі захапіла радкамі «ты ж ведаеш, у мяне цёпла»...

Дырэктар Студэнцкага гарадка БДУ Ала Мелех, узнагароджваючы ўсіх удзельнікаў дыпломамі, натхнёна падзякавала калегам:

«Я параўноўваю вашу працу з паветрам. Паветра нельга ўзяць у рукі, пераставіць, пакратаць, але без яго няма жыцця. Так і выхаваўчая праца. Дзякуй, што вы прафесійныя ў сваёй працы. Тое, што з выхаваннем у нашых інтэрнатах няма праблем, заслуга ўсіх вас».

Уручаючы прызавы дыплом загадчыцы сёмага інтэрната Нэллі Савугінай, прарэктар Уладзімір Суворай распавёў, як цяжка прыйшлося журы выбіраць найлепшага сярод лепшых, і пахваліў: «У вас правільны працоўны настрой. Мерапрыемствы захапляюць. Тое, што праводзіцца студэнтамі ў інтэрнатах, заўсёды разумна, цікава. Дзякуй вам за гэту працу».

Ад усёй вялікай сям'і студгарадка жадаем яго супрацоўнікам поспехаў у адказнай працы, новых творчых ідэй, дасягнення мэт, фінансавага дабрабыту і парадку ва ўсім!

Дар'я ШУПЕНЬКА
Фота: Валерыя ГАЎРЫЛАВЕЦ

З НАГОДЫ

Пафарбаваць свет

Цыкл мерапрыемстваў, прысвечаны Міжнароднаму дню абароны дзяцей, прайшоў ў БДУ.

Галоўнымі героямі дня 1 чэрвеня сталі дзеці і ўнукі супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта.

На 4 паверсе корпуса юрыдычнага факультэта адкрылася выстава дзіцячай і юнацкай творчасці «Летуценнікі–2017». У экспазіцыю ўвайшлі размаістыя творчыя працы больш як 40 дзяцей: малюнкі, вышыўка, вырабы, выкананыя з розных матэрыялаў.

У гэты ж дзень у аўдыторыі ФМА адбыўся конкурс «Хвіліна славы». Яго ўдзельнікамі сталі 25 юных талентаў. Яны выканалі вакальныя, харэаграфічныя і музычныя нумары.

Усіх канкурсантаў узнагародзілі памятнымі дыпломамі, прызамі і падарункамі.

Арганізатарам мерапрыемстваў выступіў Саюз жанчын БДУ.

«Дзеці абдымкаў»

2 чэрвеня Ліцэй БДУ расчыніў свае дзверы для самых таленавітых студэнтаў БДУ, навучэнцаў дзіцячага дома № 5, дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі і запрошаных артыстаў у рамках дабрачыннага канцэрта «Дзеці абдымкаў», арганізаванага валанцёрамі праекта «Кветкі жыцця». Якія неспадзеўкі чакалі гледачоў?

Праект «Дзеці абдымкаў» здзівіў сваёй насычанай праграмай! Перад пачаткам мерапрыемства гасцей сустрэлі роставыя лялькі, тэматычная фотазона, інтэрактыўныя пляцоўкі сумесна з студыяй «MiM-BSU».

Георгій Калдун, ALEN HIT, Анастасія Пеліх, Вераніка Цубікава і іншыя папулярныя выканаўцы БДУ змаглі «зарадзіць» гледачоў сваёй энергіяй.

«Разыначка» праекта – сумесныя творчыя пастаноўкі студэнтаў БДУ розных факультэтаў з дзецьмі з дзіцячага дома № 5, а таксама з юнымі талентамі з абмежаванымі магчымасцямі. Прафесіяналізм, згуртаванасць дуэтаў і трыа, якія былі прадэманстраваны на сцэне, падахвочвалі гледачоў не толькі апладзіраваць стоячы, але і плакаць ад пачуццёвасці нумароў.

Крысціна КЕЧКО

Бумеранг дабра

Дабрачынны добраахвотніцкі праект БДУ «Мая школа» арганізавала акцыю «Бумеранг дабра». Акцыя праходзіла ў два этапы. Першы этап рэалізоўваўся ў красавіку–маі, падчас яго валанцёры БДУ наведалі розныя дзіцячыя дамы Мінска з майстар-класамі па вырабе брошак у выглядзе жывёл. Дзеці сумесна з валанцёрамі стваралі па 4 брошкі – 2 пакідалі сабе, а 2 адпраўляліся ў далейшае вандраванне!

З 27 па 28 мая праходзіў другі этап акцыі. У ТРЦ Galleria Minsk знаходзіўся стэнд, побаз з якімі дружная каманда валанцёраў БДУ раздавала брашуркі са спісам неабходных тавараў у прытулкі для жывёл. Купіўшы корм ці медыкаменты для жывёл і аддаўшы іх нашым валанцёрам, кожны ўдзельнік акцыі атрымліваў цудоўныя самаробныя брошкі ці паштовачкі з падзякай ад выдатных дзетак з дзіцячых дамоў!

Яраслаў РАМАНОЎСКІ

У БДУ пачаўся набор у магістратуру

Гэта II ступень вышэйшай адукацыі, якая дазваляе ўдасканальваць веды ў прафесійнай вобласці, фармуе уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай працы, павышае канкурэнтаздольнасць і запатрабаванасць на рынку працы, а таксама падае шырокія магчымасці для кар'ернага росту і заняткі навуковай дзейнасцю. Акрамя таго, дыплом магістра пашырае геаграфію працаўладкавання молога спецыяліста. Вучоная ступень выпускніка магістратуры адпавядае навуковай ступені іншай краіны.

У конкурсе на паступленне ва ўстановы вышэйшай адукацыі для атрымання вышэйшай адукацыі II ступені могуць прымаць удзел асобы, якія атрымалі вышэйшую адукацыю I ступені, пацверджаную адпаведным дакументам аб адукацыі.

Прыём дакументаў у магістратуру БДУ пройдзе з 27 чэрвеня па 5 ліпеня, у ІБМТ - з 01 чэрвеня па 24 жніўня. Уступныя выпрабаванні будуць арганізаваны з 06 па 08 ліпеня, у ІБМТ БДУ - з 25 па 30 жніўня.

Навучанне ў магістратуры БДУ ажыццяўляецца на працягу аднаго-двух гадоў на вочнай (дзённай і вячэрняй) і завочнай формах навучання.

Адзначым, сёння ў магістратуры БДУ навучанне ідзе па 88 спецыяльнасцях. На трох з іх - «Бізнес-адміністраванне», «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі», «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі» - адукацыйны працэс вядзецца на англійскай мове.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

14 чэрвеня 2017 года
Падпісана да друку 12.06.2017 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by

Пры падтрымцы праграмы Еўрапейскага Саюза Эразмус+" EMEU "Этнічныя меншасці ў Еўрапейскім Саюзе"

Навуковы семінар праграмы Ж. Манэ «Этнічныя меншасці ў Еўропе»

У межах рэалізацыі праекта Жана Манэ «Этнічныя меншасці ў Еўропе» на гістарычным факультэце БДУ быў арганізаваны і праводзіцца навуковы семінар «Этнічныя меншасці ў Еўропе: гісторыя і сучасныя выклікі» (EMEU Guest Lectures), накіраваны на пашырэнне ведаў студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў пра гістарычныя працэсы рассялення, міграцыю і культуру этнічных меншасцяў у Еўропе, а таксама абарону іх правоў падчас еўрапейскай інтэграцыі, знаёмства з выкладчыкамі і навукоўцамі з еўрапейскіх універсітэтаў.

Адкрытая лекцыя доктара паліталогіі Андрэя Кліпы

Дадзенае мерапрыемства арганізоўвалася як дыскусійная пляцоўка, на якой студэнты, аспіранты і выкладчыкі гістарычнага факультэта і БДУ ў цэлым, а таксама іншыя зацікаўленыя асобы будуць мець магчымасць пазнаёміцца з перадавымі ідэямі ў галіне вывучэння гісторыі, культуры і прававой абароны этнічных меншасцяў у Еўропе, пачуць меркаванні і думкі перадавых і вядомых даследчыкаў у розных галінах вывучэння этнічных меншасцяў у Еўропе, далучыцца да новых падыходаў да трактоўкі гэтага феномену ў вядучых еўрапейскіх універсітэтах і навуковых цэнтрах.

Семінар стартаваў вясною 2015 года і за гэты час стаў традыцыйным і важным інструментам падрыхтоўкі маладых спецыялістаў-гісторыкаў, музеязнаўцаў і менеджараў у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Ён спачатку быў арыентаваны на гістарычную тэматыку, актуальныя пытанні, звязаныя з гістарычнымі даследаваннямі этнічных меншасцяў у Еўропе, асабліва ў рэгіёнах, якія маюць агульнае гістарычнае мінулае з Беларуссю. У першую чаргу гэта тычыцца вывучэння гісторыі Рэчы Паспалітай, французскіх і н ямецкіх сувязяў Рэчы Паспалітай, а таксама вобразаў успрымання Еўропы спадарожнікамі Рэчы Паспалітай. Серыя дакладаў і выступленняў па гэтай тэматыцы нарадзілася ў выніку правядзення міжнароднага навуковага круглага стала «Талерантнасць ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе: вытокі і традыцыі», арганізаванага на гістарычным факультэце ў ліпені 2013 года. Удзельнікі з найбуйнейшых універсітэтаў Польшчы (Варшаўскі ўніверсітэт, кракаўскі Ягелонскі ўніверсітэт, Сілезскі ўніверсітэт у Катавіцах, Вроцлаўскі ўніверсітэт, Познанскі ўніверсітэт) далі сваю згоду на ўдзел у будучым праекце Ж. Манэ ў якасці запрошаных гасцей.

У выніку студэнты, аспіранты і выкладчыкі гістарычнага факультэта БДУ, а таксама зацікаўленыя асобы атрымалі магчымасць сустрэцца з найбуйнейшымі гісторыкамі Польшчы: доктарам габілітаваным, прафесарам *Філіпам Валяньскі* (Вроцлаўскі ўніверсітэт), які пазнаёміў аўдыторыю з праблемай ўспрымання прадстаўнікамі Рэчы Паспалітай Заходняй Еўропы ў XVII–XVIII стст., а таксама з гісторыяй асобных этнічных меншасцяў у самой Рэчы Паспалітай у гэты перыяд; доктарам габілітаваным *Адамам Перлакоўскім* (Ягелонскі ўніверсітэт), раскрыць механізмы фарміравання нямецкіх супольнасцяў у Цэнтральнай Еўропе ранняга новага часу праз прызму ўплыву саксонскай дынастыі ў Рэчы Паспалітай; доктарам габілітаваным, прафесарам *Дарыюшам Рольнікам* (Сілезскі ўніверсітэт у Катавіцах), які распавёў пра дынаміку адносінаў магнатаў і шляхты Рэчы Паспалітай у XVII–XIX стст. да этнічных меншасцяў (яўрэяў, татараў, армянаў, немцаў, рускіх і інш.), канфесійных групаў рэгіёну; доктарам габілітаваным, прафесарам *Багданам Рокам* (Вроцлаўскі ўніверсітэт), які даў магчымасць скласці ўяўленне пра ролю каталіцкай царквы ў стаўленні дзяржавы і грамадства да этнічных меншасцяў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў новы час.

Значная ўвага ў межах праекта надавалася сустрэчам з этнолагамі і культурнымі антраполагамі, якія бачылі ў феномене этнічных меншасцяў у Еўропе праявы еўрапейскага мультыкультуралізму, вынік новых трэндаў у глабалізацыі і міжнародных міграцыйных працэсаў. У межах такіх падыходаў і разумення праблемы прайшлі сустрэчы з выкладчыкамі Познанскага ўніверсітэта імя А. Міцкевіча *Аркадыушам Беднарчуком* і *Каралем Вальчакам*. Доктар габілітаваны, прафесар *Ежы Ярнецкі* (Познанскі ўніверсітэт) правёў серыю сустрэч наконт вызначэння ролі культурнага турызму ў феномене этнічных меншасцяў. Удзел даследчыкаў з Пазнанскага ўніверсітэта ў рабоце семінара стаў падмуркам для падрыхтоўкі і публікацыі сумеснага навуковага зборніка, прысвечанага цэламу спектру пытанняў культурнай спадчыны ў Цэнтральнай Еўропе ў беларуска-польскай перспектыве.

Сучасныя еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы і праблема этнічных меншасцяў з'яўляецца яшчэ адной важнай тэмай, разгляду якой прысвечаны семінар. Дацэнт *Андрэй Кліпа* (Еўрапейскі ўніверсітэт Віядрына, Франкфурт-на-Одры, Германія) пазнаёміў студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў БДУ з дзяржаўнай палітыкай краін ЕС у дачыненні да этнічных меншасцяў, а прафесар міжнароднай палітыкі намеснік дырэктара школы палітыкі і міжнародных адносін Універсітэта Кента *Алена Карасцялёва* правяла кансультацыі з выкладчыкамі гістарычнага факультэта БДУ па праблемах вывучэння і выкладання ва ўніверсітэце феномену этнічных меншасцяў у ЕС у міжнароднай палітыцы.

Адзін з арганізатараў і кіраўнік модуля Ж. Манэ «Этнічныя меншасці ў ЕС» ***Сцяпан Захаркевіч*** адзначыў: «Праект дазволіў атрымаць новыя магчымасці і перспектывы для арганізацыі навучальнага працэсу на гістарычным факультэце, а дадзены семінар стаў выдатнай пляцоўкай для сустрэч і дыскусій студэнтаў і аспірантаў БДУ з еўрапейскімі выкладчыкамі, дазволіў завязаць новыя навуковыя і навучальныя кантакты, а таксама стаць зыходным пунктам некалькіх адукацыйных і навуковых праектаў гістарычнага факультэта БДУ».

Што такое праект EMEU?

З 2014–2015 па 2017–2018 навучальны год на гістарычным факультэце БДУ рэалізуецца модуль праграмы імя Жана Манэ «Этнічныя меншасці ў Еўрапейскім саюзе» (EMEU – Ethnic Minorities in the European Union), зарэгістраваны ў Міністэрстве эканомікі Беларусі як праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Арцём Назаранка і Філіп Валяньскі

Агульныя мэты праекта EMEU – пашырэнне ведаў студэнтаў і іншых членаў акадэмічнай супольнасці БДУ, іншых устаноў адукацыі Беларусі па гістарычных, сацыяльных, прававых і іншых актуальных праблемах складання і побыту этнічных меншасцяў у ЕС праз распрацоўку і ўкараненне ў навучальны працэс гістарычнага факультэта БДУ новых тэм і курсаў па адпаведнай праблематыцы; сцвярджэнне БДУ як цэнтра адукацыі і даследаванняў высокага ўзроўню па еўрапейскай праблематыцы.

У межах праекта ажыццёўлены ўводзіны абноўленай тэматыкі ў выкладанне дысцыплін «Сацыяльна-культурная антрапалогія», «Тэорыя этнічнасці і нацыяналізму», «Права ў сучасным грамадстве» для студэнтаў першай ступені; распрацоўка інтэнсіўных курсаў па гістарычных праблемах этнічных меншасцяў у ЕС для студэнтаў другой ступені, па метадалогіі даследавання праблем этнічных меншасцяў для паслядыпломнага ўзроўню; правядзенне серыі навучальных семінараў, студэнцкіх мерапрыемстваў, вэбінараў з еўрапейскімі экспертамі; завяршаецца падрыхтоўка да публікацыі распрацаваных вучэбных матэрыялаў, хрэстаматыі «Этнічныя меншасці ў Еўрапейскім саюзе: асноўныя прававыя тэксты». Для інфармацыйнай падтрымкі праекта выкарыстоўваецце спецыяльная старонка ***http://emeu.hist.bsu.by***, выкананая на англійскай, беларускай і рускай мовах (па завяршэнні праекта там будуць размешчаны ўсе падрыхтаваныя матэрыялы).

У камандзе, занятай рэалізацыяй праекта, задзейнічаны не толькі непасрэдна выкладчыкі, але і кіраўніцтва шэрагу кафедраў гістарычнага факультэта, супрацоўнікі ўпраўлення міжнародных сувязяў, фінансавых службаў. Дакладны план дзеянняў па праекце, зладжанае канструктыўнае ўзаемадзеянне розных падраздзяленняў універсітэта дазволілі атрымаць высокую ацэнку праекта EMEU з боку прадстаўнікоў Еўрапейскай камісіі. Так, у снежні 2015 г. паспяхова пройдзены маніторынг з удзелам прадстаўніка выканаўчага агенцтва па адукацыі, аудыявізуальных сродках і культуры Еўрапейскай камісіі.

Хто такі Жан Манэ?

Жан Амэр Мары Габрыэль Манэ (фр. – Jean Omer Marie Gabriel Monnet; 1888–1979) – выбітны французскі дыпламат, эканаміст. З'яўляўся перакананым і ўплывовым прыхільнікам еўрапейскага адзінства. За значную ролю ў прасоўванні ідэі стварэння Еўрапейскага аб'яднання вугалю і сталі (ECSC; фактычна на яго аснове пасля ўзнікла аб'яднанне, якое сёння мы ведаем як Еўрапейскі саюз) Жана Манэ клічуць «Бацькам Еўропы». Высокая пасада старшыні аб'яднання ECSC (1952–1955) не была для Жана Манэ першым вопытам у вялікай дыпламатыі – па заканчэнні Першай сусветнай вайны ён з 1919 па 1923 гады быў намеснікам Генеральнага сакратара Лігі нацый. Француз па паходжанні, Манэ супрацоўнічаў з Жоржам Клемансо і Шарлем дэ Голем, паспрыяў усталяванню англа-французскага саюза, у 1940 г. па рашэнні ўрада Вялікабрытаніі (Уінстан Чэрчыль) ён накіроўваецца ў ЗША для правядзення перамоў наконт ваенных закупак. У хуткім часе французскі эканаміст становіцца дарадцам амерыканскага прэзідэнта Франкліна Д. Рузвельта. Ж. Манэ пераконвае кіраўніка ЗША запусціць пашыраную праграму ваеннай вытворчасці – і каб паспрыяць развіццю эканомікі Злучаных Штатаў, і каб аказаць так неабходную дапамогу саюзнікам па антыгітлераўскай кааліцыі. Паводле трапнага выразу вядомага эканаміста Джона Кейнса, запуск праграмы «Перамога» (Victory Program) і яе актыўная каардынацыя з боку Ж. Манэ дазволілі, верагодна, скараціць на год Другую сусветную вайну. Пералічыць усе дасягненні выбітнага француза было б справай вельмі цяжкай, таму адзначым толькі, што ў 1975 г. Жана Манэ ўшанавалі званнем «Ганаровы грамадзянін Еўропы» (пасля падобную адзнаку атрымалі толькі Гельмут Коль у 1998 г. і Жак Дэлор у 2015 г.). Сапраўды, ёмістае неафіцыйнае вызначэнне «Бацька Еўропы» адпавядае постаці Жана Манэ.

Жан Манэ з прэзідэнтам ЗША Джонам Ф. Кенэдзі

Для ўшанавання дасягненняў Ж. Манэ і яго ўкладу ў развіццё еўрапейскай інтэграцыі у 1989 годзе была запушчана «Праграма Жана Манэ», скіраваная на прасоўванне ідэй мірнага супрацоўніцтва краін у Еўропе і ўсебаковае вывучэнне еўрапейскай інтэграцыі.

Што такое «Праграма Жана Манэ»?

З 1989 года з дапамогай «Праграмы Жана Манэ» было створана больш за 160 еўрапейскіх цэнтраў перадавых ведаў і даследаванняў, падтрымана каля 900 прафесарскіх кафедраў і звыш 1000 вучэбных модуляў па еўрапейскай праблематыцы. Кожны год у мерапрыемствах праграмы ўдзельнічае каля 1500 прафесараў і 500 000 студэнтаў у дзясятках краін на ўсіх кантынентах.

На сённяшні момант «Праграма Жана Манэ» ўключана як складовая частка ў праграму Еўрапейскага саюза «Эразмус+», якая аб'ядноўвае ўсе ініцыятывы ЕС у галіне адукацыі, моладзі і спорту.

Конкурс па праграме Жана Манэ – глабальны, ён адкрыты для любога ўніверсітэта любой краіны. Варта адзначыць, што па асобных інструментах праграмы падтрымку могуць атрымаць і для іншых арганізацый, актыўных у даследаванні еўрапейскай праблематыкі, а таксама асацыяцый выкладчыкаў і даследчыкаў, якія спецыялізуюцца ў даследаваннях Еўрапейскага саюза. Праекты праходзяць вельмі жорсткі адбор, эксперты цалкам аднолькава падыходзяць да ацэнкі заяўкі незалежна ад таго, знаходзіцца ўніверсітэт-заяўнік у Бельгіі, ЗША, Японіі, Кітаі, Беларусі ці любой іншай краіне. Так, падчас апошняга завершанага конкурсу заявак (2016 год) было пададзена 1034 заяўкі, з які адабрана да фінансавання 270 агульным бюджэтам каля 11 мільёнаў еўра. Заяўкі ацэньваюцца па чатырох асобных крытэрыях: рэлевантнасць, якасць праекта, якасць каманды, уплыў і распаўсюджванне.

Праекты па праграме Жана Манэ накіраваны на падтрымку і распаўсюджванне перадавога вопыту па выкладанні і навуковых даследаваннях у галіне вывучэння Еўрапейскага саюза ва ўсім свеце. Гэтыя праекты таксама закліканы стымуляваць развіццё дыялогу паміж акадэмічнай супольнасцю і палітыкамі з мэтаю паляпшэння кіравання ў ЕС і па ўсім свеце.

Даследаванні Еўрапейскага саюза ўключаюць вывучэнне Еўропы ў цэлым, з асаблівым акцэнтам на працэсе еўрапейскай інтэграцыі з улікам яе ўнутраных і знешніх аспектаў. Па задуме ЕС, праекты імя Жана Манэ павінны спрыяць актыўнай еўрапейскай грамадзянскасці і быць звязаны з роляй ЕС у глабалізаваным свеце, павышэннем інфармаванасці пра Еўрасаюз, падтрымліваць па ўсім свеце ўцягнутасць і дыялог, заснаваны на непасрэдных кантактах.

Тэматычны ахоп праграмы Жана Манэ дастаткова шырокі. Асноўнымі прадметнымі галінамі з'яўляюцца наступныя:

- ЕС і параўнальныя даследаванні рэгіяналізму;
- даследаванні ЕС у сферы камунікацыі і інфармацыі;
- эканамічныя даследаванні ЕС;
- гістарычныя даследаванні ЕС;
- даследаванні ЕС у сферы міжкультурнага дыялогу;
- міждысцыплінарныя даследаванні ЕС;
- даследаванні ЕС у галіне міжнародных адносін і дыпламатыі;
- прававыя даследаванні ЕС;
- палітычныя і адміністрацыйныя даследаванні ЕС.

Тым не менш гэтая праграма не замыкаецца на грамадскіх ці гуманітарных навуках. Розныя прадметныя галіны (напрыклад, сацыялогіі, філасофіі, рэлігіі, геаграфіі, літаратуры, мастацтва, прыродазнаўчых навук, даследаванняў навакольнага асяроддзя, глабальных даследаванняў і г.д.) таксама могуць быць звязаныя з гэтай галіной даследавання, калі яны ўключаюць у сябе элемент навучання, даследавання або пэўнай рэфлексіі адносна ЕС і спрыяюць у цэлым «еўрапеізацыі» вучэбных планаў і праграм. Прыкладам таму можа служыць модуль Жана Манэ, што ўкараняецца ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце – «Сістэмы землекарыстання ў ЕС – навука, кіраванне, палітыка».

Праграма Жана Манэ прадугледжвае фактычна шэсць канкрэтных тыпаў праектаў, разбітых на тры групы:

Праекты па навучанні і даследаваннях:

Модуль (Module) – грант на выкладанне курса (курсаў) па тэматыцы еўрапейскай інтэграцыі, які складаецца не менш чым з 40 гадзін на працягу навучальнага года (максімальная сума гранта – 30 тыс. еўра);

Прафесар / кафедра (Chair) – грант для выкладчыка, які не менш за 90 гадзін на працягу навучальнага года праводзіць заняткі на тэмы, звязаныя з пытаннямі еўрапейскай інтэграцыі (максімальная сума гранта – 50 тыс. еўра);

Цэнтр перадавых ведаў і даследаванняў (Centre of Excellence) – грант на падтрымку каардынацыйнага цэнтра кампетэнцыі і ведаў па пытаннях еўрапейскай інтэграцыі (максімальная сума гранта – 100 тыс. еўра).

Праекты па абмеркаванні палітыкі з акадэмічнай супольнасцю:

Сеткі (Networks) – грант на пашырэнне супрацоўніцтва і прасоўванне вынікаў даследаванняў па тэматыцы еўрапейскай інтэграцыі (максімальная сума гранта 300 тыс. еўра);

Праекты (Projects) – грант на вывучэнне і абмеркаванне розных методык правядзення даследаванняў у галіне еўрапейскай інтэграцыі (максімальная сума гранта – 60 тыс. еўра).

Праекты па падтрымцы асацыяцый:

Асацыяцыі (Support to Associations) – грант для аказання падтрымкі асацыяцыям, якія займаюцца вывучэннем працэсаў інтэграцыі ў ЕС (максімальная сума гранта – 50 тыс. еўра).

Асноўнымі формамі дзейнасці ў межах канкрэтных праектаў Жана Манэ становяцца распрацоўка (ці абнаўленне) і выкладанне новых курсаў, правядзенне даследаванняў, канферэнцый, мерапрыемстваў па ўсталяванні і развіцці кантактаў, публікацыйная дзейнасць па праблематыцы, звязанай з вывучэннем ЕС.

Інфармацыю пра розныя тыпы праектаў можна прадставіць наступным чынам:

Тып праекта	Максімальная сума гранта (грант, як правіла, пакрывае да 75 % бюджэту праекта)	Колькасць устаноў-удзельніц	Працягласць праекта
Jean Monnet Module	30 000	1	3 гады
Jean Monnet Chair	50 000	1	3 гады
Jean Monnet Centre of Excellence	100 000	1	3 гады
Support to Associations	50 000	1	3 гады
Jean Monnet Networks	300 000	3	3 гады
Jean Monnet Projects	60 000	1	ад 12 да 24 месяцаў

Як падаць заяўку? Трэба мець добрую цікавую ідэю, каманду аднадумцаў, не баяцца прапаноўваць свой праект і ведаць, куды звярнуцца па дапамогу з падрыхтоўкай заяўкі. Для апошняга ў БДУ ёсць добрыя магчымасці. Гэта не толькі асобны аддзел міжнародных праграм і праектаў (начальнік – Аляксандр Рытаў) ва ўпраўленні міжнародных сувязей нашага ўніверсітэта, дзе кваліфікаваныя супрацоўнікі дапамогуць разабрацца ў самых складаных замежных і беларускіх правілах падрыхтоўкі і рэалізацыі праектаў. Не менш важным з'яўляецца і тое, што ў БДУ паспяхова рэалізаваны ці знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі 5 праектаў праграмы Жана Манэ з 11, што былі адобраны для Беларусі за ўвесь час удзелу нашых універсітэтаў у гэтых конкурсах.

Графік правядзення штогадовых конкурсаў выглядае прыблізна так:

- абвяшчэнне конкурсу – кастрычнік;
- падача заявак – люты;
- ацэнка пададзеных заявак – 5 месяцаў;
- інфармаванне пра вынікі – ліпень;
- пачатак рэалізацыі праектаў – 1 верасня;

Больш падрабязна з інфармацыяй пра праграму Жана Манэ можна пазнаёміцца на сайце Еўрапейскай камісіі **http://eacea.ec.europa.eu/erasmus-plus/actions/jean-monnet_en** і на старонцы ўпраўлення міжнародных сувязяў БДУ **http://ums.bsu.by** (раздзел «Праграмы і праекты»).

Матэрыялы падрыхтавалі
Сцяпан ЗАХАРКЕВІЧ
і Арцём НАЗАРАНКА